Тыднёвік Магілёўскі

№ 2 (33)

13.02.98

На гэтым тыдні ў Менску выйшаў 100-ы нумар ***НАШАЙ НІВЫ.*** *Першая беларуская газэта была і застаецца адным з самых выдатных культурных здабыткаў беларускай нацыі ў XX стагодзьдзі. Жыве НАША НІВА! Жыве Вольная Беларусь!*

Шчыра віншуем!

Рэдакцыя ТМ.

8 ЛЮТАГА Ў МЕНСКУ прайшоў пікет супраць палітычных рэпрэсіяў у Беларусі. Праводзіўся збор подпісаў за адстаўку Лукашэнкі й за свабоду палітзняволеных Шыдлоўскага, Лабковіча і Кабанчука.

ВІЦЕБСКІ ГАРСАВЕТ адмовіўся фінансаваць мясцовую структуру БПСМ. **Пры паіменным галасаванні на «бюджэтнай» сэсіі ўзяло верх меркаванне, што дэпутаты не ўправе навязваць падаткаплацельшчыкам такія расходы.**

Для ТМ — па электроннай пошце

У БАБРУЙСКУ ЗАБІТЫ другі сакратар гаркама ЛКСМБ Сяргей Шаціла. Ягоны труп быў знойдзены ў пад'ездзе ўласнага дому. У ЦК не выключаюць магчымых палітычных матываў забойства.

14 ЛЮТАГА, У ДЗЕНЬ Сьвятога Валянціна, «Малады Фронт» праводзіць у Менску шэсце й мітынг. Плянуецца наведванне пасольстваў Вялікабрытаніі, Нямеччыны, ЗША, Італіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, Францыі, консульства Эстоніі, прадстаўніцтва ААН. Дыпламатам будуць уручаны віншаванні й пэтыцыі.

БЕЛАПАН — спэцыяльна для ТМ

Магілёўскаму паўстанню нашчадкі прысвяцілі...

Вечарыну

31 студзеня ў Магілёве, у рамках урачыстасцяў з нагоды 337-х угодкаў паўстання магілёўцаў супраць маскоўскага войску, адбылася ўрачыстая вечарына. Яна сабрала ў святочнай зале больш 100 чалавек. На яе таксама было запрошана шмат гасцей з розных гарадоў краіны. Прыехалі выдатныя беларускія барды Віктар Шалкевіч і Андрэй Мельнікаў. Апошні нядаўна, пасля 5-ці месяцаў турэмнага зняволення за «незаконны пераход беларуска-літоўскай мяжы», быў нарэшце выпушчаны на волю, хаця атрымаў штраф у памеры 10 млн. рублёў. На пытанне карэспандэнта ТМ сп. Андрэй адказаў, што пачуваецца зараз нармалёва і пакінуў для нашых чытачоў аўтограф, пажадаўшы рэдакцыі і чытачам поспехаў.







Але ж вернемся да самой вечарыны. Вельмі пасавала да святочнага настрою ўбранне памяшкання. Яно было ўпрыгожана саламянымі вырабамі ды нацыянальнымі вышыванымі ручнікамі. У перапынках паміж прамовамі гасцей і гаспадароў гучала беларуская музыка, выступалі навучэнцы клюбу бальных танцаў «Дэбют».

На адкрыцці імпрэзы выкладчыца вучылішча культуры сп. Лідзія Кузьменка прачытала «Малітву Еўфрасіньні Полацкай». Пасля яе выступу гарадскі камэрны хор выканаў «Малітву за Беларусь» на словы Натальлі Арсеньневай. Гэтае выкананне ўсе прысутныя праслухалі стоячы, тым самым ушаноўваючы памяць тых, хто змагаўся і загінуў за Вольную Беларусь...

Гісторык Ігар Марзалюк распавёў пра самае паўстанне і пра герб, які мы зараз маем гонар мець. Ён быў нададзены Магілёву менавіта ў 1661-м годзе, пасля выгнання з гораду расейскага вайсковага гарнізону. Да герба прыкладалася права на прывілеі, якія, між іншым, ураўнавалі наш горад са сталіцай — Вільняй.

Падчас вечарыны з боку гасцей было выказана шмат добрых словаў магілёўскім арганізатарам. Трэба спадзявацца, што дзякуючы гэтай цудоўнай імпрэзе сярод магілёўцаў пабольшала тых, хто даведаўся аб слаўнай падзеі з нашага мінулага і адчуў сябе грамадзянінам краіны, маючай усе правы на незалежнае вольнае развіццё.

...Пікет

У нядзелю, 1-га лютага, каля гатэлю «Днепр» у Магілёве дэмакратычныя арганізацыі правялі пікет у гонар паўстання ў 1661-м годзе жыхароў горада супраць маскоўскага войска. У пікеце ўдзельнічала каля 20-ці чалавек, якія трымалі плякаты «Беларусь будзе вольнай», «Беларусь не прадаецца», «Паўстанне супраць маскоўцаў — наша гісторыя, якую не схаваць». Сучасным магілёўцам, якія, як заўсёды апошнім часам, ставіліся да пікетчыкаў вельмі ветліва, раздаваліся матэрыялы з гістарычнымі звесткамі пра паўстанне, газэты «Тыднёвік Магілёўскі» і «Маладзёвы Весьнік» (выданне Маладога Фронту).

Наогул, у гэты ясны марозны дзень на пікеце панаваў сапраўды шчыры святочны настрой. Група міліцыянтаў, дарэчы, прыехала на месца правядзення акцыі раней за самых яе ўдзельнікаў. Цікава, што аднаго з іх адразу пазналі нашы лістападаўскія вязьні (гл. N 28 ТМ). За прайшоўшыя з тае пары некалькі месяцаў ён ужо атрымаў новыя пагоны — званне павысілі...

Акрамя ахоўнікаў у форме старанна выконваў свае абавязкі таксама даўно знаёмы мясцовым актывістам дэмакратычнага руху опер-кінааператар. Асабіста ў мяне зьявілася думка аб тым, што трэба было б пікетоўшчыкам заключыць з ім кантракт, каб атрымліваць якасную копію стужкі. І яшчэ, як мне падалося, большую яе частку ён выкарыстаў, здымаючы менавіта маладзейшых удзельнікаў акцыі.

На абодвух мерапрыемствах прысутнічаў

ДЗЯНІС НОВІКАЎ, карэспандэнт ТМ.

Пакуль не здаліся

Нядаўняя хваля страйкаў і мітынговых акцыяў пратэсту ў прадпрымальніцкіх гандлёвых калектывах краіны даволі хутка скончылася. Прыватнікі ў большасці гарадох задаволіліся абяцанем прэзыдэнта адмяніць раптоўна прапанаваныя Падатковым камітэтам «драконаўскія» змены ў сістэму налічэння і выплаты падаткаў.

Нешта не спрацавала ва ўладзе: яна хуценька адыйшла назад (хаця абяцаная адмена не пацверджана дакумэнтальна), за прыватнікаў уступіліся мясцовыя кіраўнікі улады, страйкі і мітынгі даволі смела асвятлялі афіцыйныя сродкі інфармацыі. Першымі вярнуліся на рабочыя месцы менскія гандляры, за імі — наваполацкія. Для адцягвання ўвагі ад непрацуючага стадыёна ў Магілёве запрасілі «торговый ряд» са сталіцы.

Аднак магілёўскія прыватнікі, аб'яднаныя ў Свабодны прафсаюз, працягваюць трымаць страйк. Яны заявілі, што распачнуць работу толькі пасля дакумэнтальнага афіцыйнага пацверджання адмены ўсіх падатковых «нововведений» і спрашчэння працэдуры ліцэнзавання і сертыфікацыі прадукцыі тавараў. Сёння гэтая «апэрацыя» каштуе ім шмат грошай, нэрваў і часу.

Прадпрымальнікі на сваіх амаль штодзённых мітынгах старанна і дэманстратыўна пазбягаюць «палітыкі». Ці магчыма ў нашых рэальных умовах дамагчыся чыста эканамічных даброт, дэманструючы палітычную лаяльнасць, стане ясна ў выніку «магілёўскага супрацьстаяння».

Уласная інф.

(Тэму працягвае матэрыял на 2-й стар. газэты).

А сваё начальства... абмінае

30 СТУДЗЕНЯ дэмакратычную моладзь Магілёва наведала сп. Эмі К.Стампс, другі сакратар амбасады ЗША ў Рэспубліцы Беларусь. На гэтай сустрэчы, арганізаванай, дарэчы, па просьбе спадарыні Э.К.Стампс адразу пасля сэмінара, што ладзілі прадстаўнікі мясцовага Свабоднага прафсаюза, прысутнічалі сябры трох маладзёвых арганізацый горада: «Патрыёты Бацькаўшчыны», Рух у Эўропу», Маладога Фронту і Хрысціянска-Сацыяльнага Саюзу.

Перш за ўсё Эмі К.Стампс цікавіла становішча з правамі чалавека. Падчас сустрэчы ёй былі прадстаўлены дакумэнтальныя доказы шматлікіх парушэнняў з боку ўладаў у гэтай галіне. Шмат было сказана прысутнымі і ў вуснай форме, бо ледзь не кожнаму з гэтых маладых людзей у сувязі з іх грамадска-палітычнай дзейнасцю ужо даводзілася сутыкацца як з маральным ціскам, так і з фізічным пераследам з боку «праваахоўных органаў». Спадарыня Э.К.Стампс паведаміла, што амбасада ЗША рыхтуе сваю частку штогадовага даклада аб правах і свабодах чалавека, які выдаецца ад імя Адміністрацыі ЗША. **(Гэтымі днямі даклад апублікаваны. У ім шмат разоў негатыўна ўзгадваецца Беларусь — ТМ).**

Увогуле гутарка атрымалася жывой і, думаецца, карыснай для абодвух бакоў. Цягам яе не адчувалася ніякай напружанасці і скавапнасці паміж суразмоўнікамі. Напрыканцы «Патрыёты Бацькаўшчыны» запрасілі другога сакратара амэрыканскай амбасады на святкаванне ўгодак магілёўскага паўстання 1661 г. супраць маскоўскага войска. Але, на жаль, сп. Стампс ня мела ўжо на гэта часу і выказала спадзяванне, што ў нашым горадзе яна не апошні раз. Таксама яна выказала задаволенасць вынікамі сустрэчы ды пажадала поспехаў маладым адраджэнцам.

P.S. Пасля заканчэння сустрэчы, калі яе ўдзельнікі разышліся, у офіс Свабодных прафсаюзаў (ён знаходзіцца ў жылым доме) завіталі два супрацоўнікі міліцыі. Яны сказалі, што нібыта суседзі патэлефанавалі ім і сказалі, што тут робіцца «нешта не тое». Ніякага працягу іхны візіт, аднак, не атрымаў.

ДЗЯНІС НОВІКАЎ.

АБ ПЫТАННІ ПАДАЧЫ ДЭКЛЯРАЦЫЙ АБ ДАХОДАХ ЗА 1997 Г.



Ці будзе канчаткова знішчана прадпрымальніцтва?

Артыкул напісаны з прычыны магчымых наступстваў, якія могуць напаткаць прадпрымальнікаў у сувязі са зменамі ў падаткаабкладанні, зацверджанымі загадам ДПК ад 7.08.1997 г. (N 03/106). Пры гэтым адзначым, што чыноўнікі спасылаюцца на "Дапаможнік па запаўненню дэкларацыі аб савакупным гадавым даходзе, атрыманым у 1997 годзе". Аднак гэты "дапаможнік" нікім не падпісаны, не зарэгістраваны ў Рэестры Дзяржаўнай рэгістрацыі, а таму па юрыдычнай моцы раўнацэнны надпісу на плоце ці сцяне.

Але ж, мы ведаем беларускі народ, для якога ледзь не любая паперка з кабінета мае моц большую за Законы і Канстытуцыю разам узятыя. На гэты раз, праўда, для многіх нечакана прадпрымальнікі адазваліся страйкамі і бурлівымі сходамі. Наш "добры прэзыдэнт" абяцаў навесці парадак, адмяніць "перагібы". (Магчыма, што да выхаду нашай газэты гэта сапраўды будзе зроблена). Аднак праблема існавання прадпрымальніцтва гэтым не будзе вырашана. Яна ў нас значна глыбей: тут вам і грамадская псіхалёгія, і дзяржаўная стратэгія.

У склаўшыхся абставінах для прыватнікаў значэнне маюць і таму актыўна абмяркоўваюцца два шляхі паводзінаў: **падаваць** ці **не падаваць** дэкларацыю аб савакупным гадавым даходзе да 15 лютага 1998 г. Разгледзім абодва варыянты.

Калі прадпрымальнік **не падае** дэкларацыю аб даходах, атрыманых за год, то наступае адказнасць па арт. 9 п. 12 ч. 5 Закона РБ "Аб падатках і зборах, збіраемых у бюджэт РБ", а менавіта: штраф у памеры ад двух-да пяцікратнай месяцовай мінімальнай зарплаты, альбо па арт. 9 п. 13 гэтага ж Закона —крымінальная адказнасць. Акрамя таго, ён павінен будзе заплаціць яшчэ шалёныя сумы дадатковых "штрафных" падаткаў.

Словам, прадпрымальнік у такім разе парушыць Закон і абараніцца праз суд будзе нерэальна. Гэта будзе выкарыстана ўладамі для канчатковага разгрому прадпрымальніцтва. Аперацыя па знішчэнню будзе праведзена татальна і фатальна. Разам з прадпрымальніцтвам будуць знішчаны, альбо безапраўна скампраметаваны і тыя, пад чыім "крылом" знаходзіцца сёння прадпрымальніцкі рух і хто практычна адзіны яго абараняе — Свабодныя Прафсаюзы.

Калі прадпрымальнік **падае** дэкларацыю, але не прызнае змяненняў і дадаткаў па раздзелу "Валавы даход", падзеі будуць развівацца наступным чынам. Прадпрымальнік павінен запоўніць дэкларацыю аб савакупным гадавым даходзе. У раздзеле III у п. 19 "Перыяд ажыццяўлення дзейнасці" у графе "Колькасць дней работы" трэба будзе ўказаць колькасць дзён працы па асноўнаму месцу працы (там дзе знаходзіцца яго працоўная кніжка). Калі прадпрымальнік не працаваў у 1997 г. па "трудовому соглашению" і працоўная кніжка ўвесь год была ў яго на руках, то колькасць дзён працы роўная 0 (нулю). У гэты перыяд ён ажыццяўляў толькі прадпрымальніцкую дзейнасць. (Вышэй жа згаданы ("дапаможнік" патрабуе зрабіць наадварот). Аднак ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці і работа — гэта розныя паняцці. Падаткаабкладанне з даходаў ад работы ажыццяўляецца па іншых раздзелах дэкларацыі, а колькасць дзён работы падлічваецца згодна запісу ў працоўнай кніжцы. Інспектар, які з гэтым не пагадзіцца, няхай сам і робіць неабходныя падлікі-разлікі і ўпісвае іх у вашую дэкларацыю. Рабіць гэта яму, праўда, законам забаронена, аднак жа ў нас шмат "старанных і чэсных" чыноўнікаў. Няхай сабе і пакажуць.

А прадпрымальнікі і ў першым, і ў другім варыянтах пакажуць, што ніхто не збіраецца парушаць законы, акрамя самой улады. Што, між іншым, ясна і так, бо мы гэта бачым штодзень.

Таму хутчэй за ўсё ніякія законныя захады не дадуць плёну і ўлада працягне сваё змаганне з "вшивыми блохами". Лепш за ўсё, калі пасыпяцца спагнанні, не мітусіцца, не палохацца і спаслаўшыся на адсутнасць грошай (бо іх сапраўды няма) і іншыя прычыны (фактычныя, а не выдуманыя), спакойна чакаць выклікаў у суды і візытаў судовых выканаўцаў: гэта добра загрузіць работай на "карысць Айчыны" падатковых службоўцаў, суддзяў і іх памочнікаў. Тым часам інфляцыя будзе змяншаць і штрафы і сумы іншых выплатаў.

...Мае парады можна расцэньваць і як жарт, больш-менш удалы. Насамрэч варта, каб супрацьстаяць свавольству ўлады, працягваць ужо распачатыя прафсаюзамі і прадпрымальнікамі акцыі пратэсту і адстойвання сваіх грамадзянскіх і прафэсійных правоў.

Віктар АБРАМОВІЧ,
прадпрымальнік,
сябра Свабоднага прафсаюза.

За мяжой катастрофы

Пару год таму давялося пазнаёміцца з хлопцам, які "праславіўся" тым, што вынес з хаты амаль увесь посуд і прапіў. Гэты выпадак "выплыў" у мяне з памяці, калі я праглядаў старонку рэкламы ў адной з магілёўскіх газэтаў, заснавальнікамі якой пазначаны магілёўскія гарвыканкам і гарсавет. На чвэрць паласы красавалася рэклама гарэлкі "Золотая корона": "Этот продукт обладает неповторимым вкусом, утонченным ароматом, а главное —лечебными свойствами", — было надрукавана ў пэрыядычным выданні з накладам 17.000 экземпляраў.

Натуральна, пасля такой рэкламы колькасць жадаючых "падлячыцца" у нашым "хворым" грамадстве можа значна павялічыцца. Але ці ўсе лекі зьяўляюцца карыснымі? Які ад іх выкарыстання можа быць "пабочны эфект"?

У Беларусі афіцыйна зарэгістравана больш за 150.000 хранічных алкаголікаў, у Магілёве ў наркалагічных кабінетах прынятыя на ўлік больш за 17.000 нашых землякоў. У 1997 г. у медвыцвярэзніках пабывала 24.780 жыхароў горада. Алкагалізм захапіў значную частку насельніцтва, у тым ліку жанчын і падлеткаў. Палова дзяцей 11-13 гадовага ўзросту ўжо ўжывала алкаголь. Бытавое п'янства захлёствае цэлыя вёскі.

Па меркаванні Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, калі ў разліку на аднаго жыхара краіны ўжыванне алкаголю дасягае 8 літраў у год, то такая нацыя знаходзіцца на мяжы генэтычнай катастрофы. У Беларусі на кожнага жыхара прыпадае каля 25-30 літраў у год. Пры гэтым колькасць вытворцаў моцных напояў з кожным годам павялічваецца. Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод, магілёўскі і бабруйскія заводы напояў, бабруйскі завод вінаградных вінаў — усе яны пастаўляюць сваю прадукцыю ў наш горад. Апошні "хіт сэзону" — так званы "русский йогурт" — пластыкавыя стаканы ёмістасцю 200 г з танным, прабачце, пойлам. А яшчэ плянуецца, што ў гэтым годзе імпарт гарэлкі замежнай вытворчасці вырасце на 12,5% у параўнанні з годам мінулым.

Тут трэба заўважыць, што не ўлічваюцца моцныя напоі хатняй вытворчасці. У 1997 г. у Магілёўскай вобласці работнікі міліцыі сканфіскавалі 727 самагонных апаратаў, выявілі 2.708 пунктаў продажу самагону. Прычым, артыкул 161 Адміністрацыйнага кодэксу прадугледжвае за гэтае праваапарушэнне штраф у памеры ад 3 да 5 мінімальных заробкаў — зусім капейкі ў параўнанні са штрафамі па дэкрэту N 5! Мабыць, пікет больш шкодны для дзяржавы?

А між іншым, адсутнасць маральных крытэрыяў у грамадстве, ігнараванне хрысціянскіх каштоўнасцяў і празмерная алкагалізацыя насельніцтва робяць сваю чорную справу. За апошнія 10 год злачыннасць павялічылася ў 6 разоў. 10% усіх згвалтаванняў былі здзейснены хранічнымі алкаголікамі. У мінулым годзе было зарэгістравана каля 300 забойстваў на глебе "бытавухі". Дзеці п'юць разам з бацькамі, лаюцца, а потым хапаюцца за ўсё, што трапіць у рукі: нож, сякеру, палку... З кожным годам расце колькасць тых, хто за пляшку гарэлкі гатовы забіць чалавека.

Зразумела, гэтую праблему неабходна вырашаць на дзяржаўным узроўні. Але, падаецца, што першыя асобы нашай дзяржавы не надта ёю заклапочаныя. Прэзыдэнт перад тэлекамерамі п'е "огромный бокал водки" за "яднанне славянскіх народаў", выявы праваслаўных храмаў упрыгожваюць сабой этыкеткі некаторых гатункаў гарэлкі...

Якое ж тут можна прапанаваць выйсце? Лічу, што ў цяперашніх умовах усе нашы людзі, асабліва моладзь, павінны зрабіць свой выбар. Выбар на карысць годнага і здаровага жыцця. Няўжо мы будзем дапамагаць свайму ж знішчэнню, разлічваючы толькі на ўратаванне ад Бога? На яго, кажуць, спадзявайся, але варушыся й сам.

Аляксандр БУРАКОЎ,
старшыня Магілёўскага Маладзёжнага хрысціянска-сацыяльнага саюза.



НАША СУДОВАЯ ПРАКТЫКА: ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

Адміністрацыя свайго дачакалася-2

Газэта працягвае сачыць за развіццём перасьледу, які актыўна распачалі ў тралейбусным упраўленні супраць кіроўцы Віктара Тарноўскага (ТМ N 1). Гэтымі днямі скончылася трэцяе судовае паседжанне магілёўскага Цэнтральнага суда пад старшынствам Людмілы Гаўрыленкі па зыску В.Тарноўскага і Свабодных прафсаюзаў, якія абскарджвалі неадэкватна жорсткія меры, прынятыя адміністрацыяй да кіроўцы па факту нібыта парушэння ім дысцыпліны.

Суд выказаўся на карысць адміністрацыі. На жаль, спраўдзілася прадбачанне нашай газэты, выказанае яшчэ мінулай восенню (дарэчы, на прыкладзе ўсё таго ж тралейбуснага ўпраўлення) аб тым, што пасля прыняцця дэкрэту аб "дысцыпліне" цяжэй або зусім немагчыма стане абараняць у нашых судах правы "простага" рабочага чалавека.

Аднак вернемся да справы. За якое ж парушэнне пераследуецца Віктар Тарноўскі? У ноч з 21 на 22 кастрычніка 1997 г. ён вярнуўся ў парк раней заканчэння рабочай змены з некаторымі паломкамі ў тралейбусе, у ліку якіх былі няспраўныя дзверы. Інструкцыя ў падобных выпадках (асабліва, што тычыцца дзвярэй) не толькі дазваляе, а абавязвае кіроўцу рушыць у дэпо ці да бліжэйшай рамонтнай майстэрні. У інструкцыі ёсць і такая агаворка: рушыць трэба карацейшым шляхам, зразумела, каб даехаць хутчэй.

В.Тарноўскі выбраў такі маршрут: пр.Дзімітрава — пр. Пушкіна — пл. Арджанікідзе — вул. Чалюскінцаў —дэпо. Начальства вырашыла, што больш "правільна" было б ехаць так: пр. Дзімітрава — пр. Пушкіна — вул. Габраўская — пр. Шмідта —вул. Касманаўтаў — вул. Чалюскінцаў — дэпо.

Уражвае прынцыповасць адміністрацыі: гэты, другі маршрут, сапраўды карацей ажно на... 100 метраў, што пацверджана пратаколам "экспертнай паездкі", на якую не пашкадавалі ні часу, ні сродкаў. Тлумачэнні В.Тарноўскага ў судзе, што на выбраным ім маршруце 3 стрэлкі, а на "начальніцкім" — 5, ніхто пад увагу не ўзяў. Між тым пераключэнне стрэлак уплывае на хуткасць руху, а значыць мае адносіны да таго, што называецца "хутчэйшым вяртаннем у дэпо".

Ні на што не пазіраючы адміністрацыя шпарка склала ўсе паперы і зацвердзіла факт "грубого нарушения дисциплины" загадам, які, пасля візіравання адпаведнымі службовымі асобамі, падпісаў начальнік тралейбуснага ўпраўлення. Загад пазбаўляў В.Тарноўскага стопрацэнтовай прэміі за месяц і станавіўся падставай для звальнення праз два месяцы. Гэты дакумент далі пад роспіс прачытаць В.Тарноўскаму. Ён прачытаў наступнае: "...в ночь с 21 на 22.07.97 г. ..." Як гаворыцца — чорным па беламу. Але ні ў які дзень 07 месяца ён не мог нічога парушыць, бо адсутнічаў на працы па прычыне законнага адпачынку. Віктар пацісну плячыма і пакінуў на загадзе зусім справядлівы надпіс "не согласен".

У такім выглядзе загад і патрапіў (праз колькі месяцаў!) у Цэнтральны суд, куды па абарону звярнуліся В.Тарноўскі са сведкамі і юрыстам Свабодных прафсаюзаў... Ва ўсім свеце любы сумнеў, любая памылка, любая недакладнасць аўтаматычна запісваюцца на карысць таго, каго абвінавачваюць. Але не ў нас. Суддзя па сваёй ініцыятыве абвесціла перапынак, даўшы распараджэнне прадстаўнікам адміністрацыі хуценька даставіць у суд сакратарку, якая памылілася, для дачы тлумачэнняў, і з загадам аб яе тэрміновым пакаранні. Што і было зроблена, бо службовая машына ўпраўлення ўсе дні судовых паседжанняў спраўна дзяжурыла ля судовага ганку. (А пасля паседжанняў развозіла стаміўшыхся прадстаўнікоў адміністрацыі па хатах ці іншых справах).

Ды памылка ў загадзе, на першы выгляд, сапраўды дробязная і недарэчная. Але, з другога боку, ці ж гэта "дробязь" у адказных і сур'ёзных паперах, якія тычацца лёсу чалавека? І як павінны мы ставіцца да сур'ёзнасці і адказнасці цэлага натоўпу начальства, у якога, калі сказаць без залішняй дэлікатнасці, толькі і работы, што прагледзець паперы і падпісаць іх. Недарэчная сакратарка, выходзіць, у іх апошняя інстанцыя парадку.

Начальства перамагло рабочага. Гэта 10 папярэдніх гадоў, што працаваў Віктар Тарноўскі ў тралейбусным упраўленні, на яго сыпаліся прэміі і падзякі. А два апошніх — адныя прэтэнзіі. Гэтыя два гады ён узначальвае пярвічную арганізацыю Дэмакратычнага прафсаюза транспартнікаў. Гэта і ёсць шчыры адказ на ўсе ягоныя службовыя непрыемнасці.

Перамагло начальства... Не выстаяў супраць ягонага "дэсанта" і наш самы справядлівы суд. Яго, зразумела, уразіла, што "лично" у паседжаннях суда штодзённа прымалі ўдзел: нач. тралейбуснага ўпраўлення Манастырэнка, гал. інжынер Падголін, нам. нач. упраўлення Бондараў, юрыст упраўлення Іванчыкаў, нач. службы руху Перкін, майстар Лбоў, прыёмшчык Бурыба, тэхнік па раскладу руху Сафонава...

Між іншым было заўважана, што ніхто з іх не адзначаў у судовай канцыляры судовых павестак. Ды і навошта, калі яны выконвалі "патрыятычную" справу абароны гонару свайго прадпрыемства. А гэта вартае не толькі нейкіх там фармалёвых "васьмёрак" у рабочым табелю, а нават і большага заахвочвання. Начальства, думаю, разбярэцца з гэтым без нас, а нам застаецца толькі чакаць, што скажа на ўсё гэта абласны суд, куды звярнуліся В.Тарноўскі і ягоныя абаронцы. Ну, а потым паспяшацца на новы суд, дзе будзе абскарджвацца ягонае звальненне, аб якім яго радасна папярэдзіла родная адміністрацыя. Яна дачакалася моманту і ўжо паказала, што свайго не ўпусціць.

Генадзь СУДНІК.



Ці па дарозе нам?

У афіцыйных ды апазыцыйных СМІ зараз можна пачуць ды прачытаць мноства меркаванняў на гэты конт. У гэтым лісце я не стаўлю мэтай спрачацца й прысуджваць нікому рацыю. Выкажу свой уласны пункт гледжання, але спачатку —невялікае адступленне.

Неяк едучы электрацыяй у Менск, я пачуў такія словы (цытую даслоўна): "Ты што эта, тваю маць, рускій народ хаіш! Чэм он цябе не ўгадзіў?" Так выказаўся ў размове з выпадковым папутчыкам адзін з пасажыраў, "беларус з Дуброўна", як ён сам назваўся. Уступіўшы ў спрэчку, я адмыслова задаў яму пытанне: а ці па дарозе нам з Расеяй? Зразумела, што ёд адказаў станоўча. Аргумэнты, праўда, былі ў яго нецікавыя: з Расеяй трэба злучацца таму, што ў яе ёсць рэсурсы, г.зн. нафта, газ і да т.п. А таксама таму, што культуры і мовы ў нас "братнія". Відавочна, што такія думкі я падтрымаць не мог, і "беларус з Дуброўна" паабяцаў мяне "здать у міліцыю як нарушыцеля абшчественага спакойствія і разжыгацеля межнацыянальнай розні".

Прашу ў шаноўнага спадарства выбачэння за гэткае адступленне, але я зрабіў яго дзеля таго, каб далей нам лягчэй было разважаць пра тое, кім ёсць наш "друг і брат".

Больш за дзвесце год таму, пасля анэксіі Вялікага Княства Літоўскага (Беларусі) Расеяй, тут пачалася татальная русіфікацыя. Гвалтоўнае пераўтварэнне ліцьвінаў (тагачасных беларусаў) у расейцаў, іхных земляў у "Северо-Западный край", адміністрацыйнае знаходжанне Беларусі ў складзе Расейскай імпэрыі ды СССР зрабілі сваю справу. Спрабуючы знішчыць нашую краіну, нацыю, мову й культуру, расейскія акупацыйныя ўлады здзейснілі вялікае злачынства. Наогул усё знішчыць ім не ўдалося, затое ўдалося прывесці Беларусь у такі стан, што зараз шмат беларусаў не ведаюць, хто яны і адкуль. Мова пераўтварылася ў нейкі дыялект. Большыня нашых суайчыннікаў акрамя "Міколкі-паравоза" нічога ў жыцці па-беларуску не чыталі. Больш таго, умушальная колькасць жыхароў нават не разумее беларускай мовы...

Разам з тым акупанты-анэксатары не прынеслі нам нічога, акрамя войнаў, п'янства, пяноты й мацюкоў. Таму я лічу, што не па дарозе нам з Расеяй. У Беларусі ёсць іншы шлях — шлях незалежнага вольнага гаспадарства. Расея ж хай будзе толькі нашай суседкаю, як, напрыклад, Польшча ці Летува. А праблема рэсурсаў пры наяўнасці свабоднай рынкавай эканомікі вырашаецца элементарна. Толькі на шляху незалежнасці ды адраджэння мы падымем Беларусь. Тады прыйдзе да людзей свядомасць і дабрабыт. Але ж і пачынаць кожнаму з нас трэба зараз, пакуль яшчэ ёсць для гэтага час.

Сяржук ГІРКІН.

У прадчуванні навальніцы

...За вакном ноч. Нешта не спіцца сёння. Вось і пацягнулася рука да паперы і алоўка.

Быццам неўпрыкмет пачаўся новы год, ды яшчэ і хуткасць набраў — вось ужо і да вясны блізка. А я ўсё не магу пазбавіцца роздуму і ўспамінаў пра год мінулы.

Узгадваюцца ягоныя фэсты і святы, аздобленыя дзяржаўнай падтрымкай і таму гучныя, шумлівыя, шчодрыя на перапоўненыя залы і фэервэркі. Ягоныя газэтныя працоўныя рапарты аб выкананні і перавыкананні ўсіх паказчыкаў, чаму пазайздросціў на нядаўнім урачыстым пасяджэнні (60 год вобласці) нават прысланы Лужковым маскоўскі чыноўнік. Ягоныя пераможныя інтэрв'ю аб далейшым умацаванні законнасці і правапарадку, што асабліва спадабаецца расейскаму генералу Кулікову, які за савецкім часам служыў у МВД тут, пад Магілёвам, аб чым час ад часу і напамінае "землякам" настальгічнымі тэлеграмамі...

Магчыма, што калі глядзець на Беларусь звонку, вачыма нашых "палітычна-стратэгічных сяброў", сапраўды можа здацца, што ў нас усё добра, надзейна, стабільна. Адное заміласванне... Так хоча думаць і ўлада. Тэму любога, хто сумняваецца, абвяшчае ворагам, здраднікам і ўтрыманцам замежных спецслужбаў. Многія ў нас, на жаль, гэтаму прапагандысцка-псіхалагічнаму націску ў духу кашпіроўшчыны паддаюцца. Або проста не прызнаюцца сабе ў адваротным, бо засвоілі за савецкім часам, што так нібы лягчэй жыць.

Мне, напрыклад, так цяжэй. Можа таму, што па маладосці не надта і заспеў той савецкі час. Можа па якой іншай прычыне. Бог ведае. Але гляджу на ўсё, зразумела, не звонку. Тут жыву. Хаджу штодзень па гарадскіх вуліцах, часта наведваю родную вёску. Сустракаюся з сябрамі і знаёмымі. Бываю ў крамах, на кірмашах...

Тут жыву і таму бачу і разумею, што амаль усё выдаваемае ўладай за дасягненні — ёсць няпраўда: і стабільнасці няма, і рэформаў нябачна, і культура ў заняпадзе, і святкуем мы не з душы, а з прымусу. Бо ва ўсім, чым жывём, няма Праўды. А значыць усё, што робіцца ўладай і ўсё, да чаго яна імкнецца, пярэчыць натуральным умовам існавання і развіцця як асобы, так і грамадства. Красамоўна пацвердзілі гэта апошнія "кірмашовыя" падзеі.

Сапраўды, ня можна нармалёва жыць і працаваць у краіне, у якой не вызначана стратэгія Адраджэння, не ставіцца задача вяртання народу ягонай мовы і гісторыі, няма падтрымкі і засвання дэмакратычных каштоўнасцяў. На жаль, многія ў нас мяркуюць, што можна, мінаючы гэтыя праблемы і задачы, патрапіць адразу ў цывілізаваны стан, стаць эўрапейскай краінай, правесці рынкавыя або якія іншыя рэформы. Марныя спадзяванні, бо што можна зрабіць у краіне, якая не вызнала самая сябе, якая не акрэсліла для грамадства ніводнай зразумелай, разумнай і яднаючай ідэі, акрамя "сплачэння" вакол прэзыдэнта, які пры гэтым марыць аб Крамлі і гатовы заплаціць за сваю палітычную кар'еру ліквідацыяй самой гэтай краіны. Адсюль у нас паслядоўнае зацісканне свабоды слова і грамадскіх ініцыятываў, парушэнні правоў чалавека, вышукванне і пераслед нацыянальна свядомых людзей... Якая там прыватнасць! На гэтым фоне наогул немагчымая ніякая разумная і карысная выніковая ўнутраная і знешняя палітыка. Так што сёння не спадабаліся прыватнікі, а заўтра прыйдуць па другіх, потым па трэціх...

Калі ведаеш усё гэта, бачыш і адчуваеш (іншым разам на сябе і сябрах непасрэдна), становіцца цяжка на душы. Мо таму і ня спіцца. Аднак і прадчування канчатковасці навалы, што абрынулася на краіну, няма. Ёсць прадчуванне навальніцы...

Яе наблізяць сваёй прыстойнасцю і верай, паводзінамі і небаязлівасцю Вадзім Лабковіч, Алесь Шыдлоўскі, Вадзім Кабанчук — нашыя цяперашнія за ўсіх закратныя пакутнікі. У гэтым раду мае знаёмцы, якімі ганаруся, — Валадар Цурпанаў, Сяргей Абадоўскі, Сяржук Гіркін, Ясь Абадоўскі, Алесь Асіпцоў, Дзяніс Новікаў. Ведаю, як няпроста ім і многім іншым у гэтых неспрыяльных для праўды, прыстойнасці і нацыянальнага самаадчування ўмовах быць і заставацца самімі сабой. Гэта значыць — заставацца людзьмі, на якіх надзея.

Няхай не пакрыўдзяцца яны на мяне за "высокі слог". Думаю, нам часцяком не хапае смеласці наўпрост сказаць чалавеку як добрае, так і непрыемнае. Вось і жывём у скажоным свеце хлусні і цынізму, пазбягаем шчырасці і праўды. Выжываем, адным словам, што сталася апошнім часам ледзь не галоўнай нацыянальнай адметнасцю.

А гэта і не жыццё, і не выжыванне. Так не можа цягнуцца доўга. Душа людская не вытрымлівае існавання на такім падмурку. Надыйдзе іншы час, вернуцца да нас сумленне і розум, прыстойнасць і любоў. Мо не аднаму мне адчуваецца ў наваколлі надыход навальніцы. Яна грымне! Мы вернемся да Сябе і Бацькаўшчыны.

Вялікая перашкода на гэтым шляху — цяперашняя ўлада і асоба на чале яе. Аднак гэтая асоба, а многія называюць яе іншым словам, не прыйшла на пасаду гвалтоўна.

Народ сам памыліўся. Народ сам і выправіць памылку. Народ сам і адбудуе пакуль яшчэ не дашчэнту парушаны свой Дом.

...Хутчэй бы прыйшоў гэты час. Вось як гэтая раніца, што неўпрыкмет і пакуль баязліва зазірнула ў маё вакно. Але я ведаю: не паспееш азірнуцца, як забуяе дзень.

Ноч скончылася, саступаючы дарогу святлу.

Алесь ФАМІН.



"Ты будзеш араць, а я буду панаваць..."

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

За савецкім часам на старонках газет час ад часу друкаваліся паэтычныя творы, якія выдаваліся за фальклёрныя. Яны былі аднолькавыя прымітыўнасцю формы і невыразнасцю зместу. Сярод іх пераважалі песні і прыпеўкі на тэмы сучаснасці. Адлюстроўвалі жыццё беларускага селяніна і яго краіны.

Асабліва бязьмерна ў 30-я гады ўсхваляліся Сталін і яго паплечнікі, дзяржаўны ўклад і ўмовы жыцця. Вядома, бытавалі ў народзе творы, у якіх крытычна ацэньвалася тагачасная рэчаіснасць, і гэтыя творы ў большасці сваёй нам усім невядомыя. Вось некалькі параўнальных прыкладаў:

Да ўлады мы прыйшлі
Праз буры рэвалюцыі.
Хай жыве вялікі Сталін,
Тварэц Канстытуцыі.

А што за сонца яснае
Над зямлёй усёй гарыць?
А гэта наш любімы Сталін
Цяпло і шчасце нам дарыць.

І трапны паказ гэтага шчасця, у даволі фрывольнай форме:

Усё па плану, усё па плану,
С... веляць па кілаграму.
Хлеб даюць па дзвесце грам,
Адкуль жа ўзяць той кілаграм.

Неадназначнае адлюстраванне атрымаў у прыпеўках і калгасны лад жыцця:

Мы калгас пабудавалі,
Імя Леніна далі.
У калгасе мы шчасліва і заможна зажылі.

"Шчаслівае" жыццё працягвалася:

Я ўпляла ў касу істужку,
Яна развіваецца.
Што нам Ленін гаварыў,
Тое ўсё збываецца.

Што збылося — добра паказана ў наступнай прыпеўке:

Хлопцы ўсе гулядь ідуць,
А мне нечага абуць.
Лапці новыя згарэлі,
І страхоўкі не даюць.

Людзі бачылі ці хацелі бачыць у калгасах свой паратунак ад голаду, шлях да лепшага жыцця.

Стала добра ў калгасе,
Усё па новаму пайшло,
Гэта радасна жыццё
Нам пры Сталіне прыйшло.
Свеціць месяц, свеціць дальні
На калгасныя палі,
Тут нам партыя і Сталін
Шчасце добрае далі.

Аднак партыя і Сталін вывозілі з калгасаў усё зерне, часам нават не пакідалі на насенне. Паўгалоднае існаванне сялян, якіх было больш двух трэціх насельніцтва, выклікала зьяўленне наступнага твору:

Шлюць пшаніцу за граніцу,
А картоплі на віно,
Галоднаму ж калгасніку
Паказваюць кіно.

Неадназначнае адлюстраванне калгаснага ладу і эксперыменту было і ў 50-я гады:

Гарманіст гармонь расцягне,
Мы з табою падпяём.
Як пасадзім кукурузу,
Яшчэ лепей зажывём.
Палюбіла палявода,
Палюбіла на бяду:
Ён пасеяў кукурузу,
А сабралі лебяду.

Вярнуўшыся назад, у 30-я, мы ўбачым, як зласліва гучалі заклікі да расправы з "ворагамі народа". Вынікі судоў часам паведамляліся —чысцей за ўсё растрэлы. А народ, весела прыскокваючы, "аднадушна адабраў" і з асаблівай любоўю дзякаваў:

Дзякуй Сталіну роднаму,
Варашылаву паклон,
І Яжову дарагому
Мы прывет гарачы шлём.
Сарву кветачку прыгожу
Па крутому рову,
За харошую работу
Дзякуем Яжову.

Шчыра дзякавалі за вынесеныя прысуды 3.778 234-м чалавекам, з якіх 786.098 былі растраляны (па звестках Калегіі КГБ СССР у 1990 г.).

На жаль, мы ня можам грунтоўна характарызаваць творы, у якіх адлюстроўвалася праўда жыцця, таму што іх у той час не запісвалі, і ў памяці амаль не захоўвалі. Ніхто асабліва іх і не збіраў. У зборніках тых, да і пазнейшых часоў іх таксама не знойдзеш. Вядомы адзінкавыя:

Цвіце, цвіце чарамшына,
Пад ёй балахоўцы.
Парубалі продразвёрстку
Маладыя хлопцы.
Едзе, едзе камуністы,
У рэвольвер свечка.
Хавай, баба, хлеб ды сала —
Камуністы едзе!
Едзе Ленін на свінні,
Сталін на сабацы.
А яўрэй глядзіць у вакно —
Едуць мае братцы.

Але яшчэ і сёння дзе-нідзе можна запісаць фальклёрныя творы, што ўзніклі ў 20-30-я гады. У наш час паўстала задача сабраць гэты фальклёрны матэрыял і аднавіць гістарычную праўду. Таму мы звяртаемся да чытачоў, калі каму вядомыя прыпеўку 20-50-х гадоў, дасылайце нам у ТМ.

А на заканчэнне хачу прапанаваць вам прыпеўку 30-х гадоў, якая вельмі падыходзіць да сённяшняга часу:

Ой, Ванечка, Ванечка,
Мы з табою парачка.
Табе — саха, барана.
Мне — чужая старана.
Ты будзеш касіць, араць,
А я буду панаваць.

А.КРАСНАСЛАБОДЦАЎ,
гісторык.



МОЎНЫЯ СПРЭЧКІ

Працэнт ці адсотка?

Цікава параўноўваць часы даўнія і падзеі сённяшнія. Карысна помніць набітыя шышкі і зробленыя памылкі. Бо навошта ж паўтараць?..

У дваццатыя гады быў нечым падобны ўсплёск беларускага адраджэння — выдаваліся слоўнікі, ствараліся беларускамоўныя навуковыя тэксты, удакладнялася навуковая тэрміналогія. Імкненне зрабіць «занадта ж сваё» дзе-нідзе пераважвала. І нават для тэрмінаў грэцкага ці лацінскага паходжання, агульнапрынятых у навуковым асяроддзі розных краін, прынцыпова ствараліся беларускія аналагі. Так «перпендыкуляр» ператварыўся ў «старчак», «прызма» — у «кантаслуп», «гіпатэнузу» замянілі «ускосінай». Але не прыжыліся наватворы, час вярнуў усё на месца.

Цяпер гэткая ж валтузня з тэрмінам «працэнт», які «занадта-беларусы» упарта называюць «адсоткай». Паспрабуем разабрацца.

З даўніх часоў (асабліва пасля пераносу ў Еўропу індускай — дзесятковай —сістэмы лічэння, якой мы сёння і карыстаемся) выдзяляюць сотую і тысячную долі асобнымі назвамі і асобнымі знакамі — працэнт і праміле (ад лацінскіх «pro zentum» — на сто і «pro mille» — на тысячу). Так гучаць гэтыя словы сёння ва ўсім свеце (прынамсі ў Еўропе і Амерыцы). Наўрад ці трэба тут беларусам адгароджвацца асабіста сваім словам.

Аматарам «адсоткаў» я б параіў быць паслядоўнымі і называць праміле «адтысячкамі»(«ці адтысяткамі»). Відавочна, што ў беларускай мове «працэнт» і «праміле» вымаўляюцца прасцей і лагодней, чым «адсоткі» і «адтысяткі».

Усе такія пытанні абмяркоўваліся на дзвюх навуковых тэрміналагічных канферэнцыях, якія адбыліся ў пачатку 90-х гадоў. Вынікам гэтых канферэнцый стала выданне некалькіх расійска-беларускіх слоўнікаў навуковай тэрміналогіі, у тым ліку — трох матэматычных слоўнікаў, адзін з якіх выдадзены ў Магілёве. Афіцыйныя выдавецтвы пакуль імкнуцца не заўважаць гэтых слоўнікаў, але, дзякаваць Богу, не ўсе выдавецтвы ў Беларусі дзяржаўныя. І ўдакладненая навуковая тэрміналогія ўсё актыўней прабівае сабе дарогу на старонкі кніг, часопісаў, падручнікаў.


Але ва ўсіх гэтых слоўніках (нават у самым радыкальным слоўніку, створаным тэрміналагічнай камісіяй Таварыства беларускай мовы) працэнт застаўся працэнтам. То ж, мо й не трэба, браткі-беларусы, займацца моўнай самадзейнасцю?

**Міхась Булавацкі,
старшыня абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.**

Адказы на крыжаслоў, апублікаваны ў мінулым (1) нумары Тыднёвіка

Па гарызанталі: 7. Старызна. 8. Радзімка. 9. Пляск. 10. Кукса. 11. Пожаг. 14. Недаверак. 17. Цецярук. 18. Матачка. 19. Кавалер. 21. Калатня. 25. Іншаземец. 28. Пярун. 29. Дыван. 30. Човен. 31. Бараніна. 32. Ужыванне.

Па вертыкалі: 1. Сталенне. 2. Брусы. 3. Мацунак. 4. Прасцяк. 5. Кідок. 6. Скразняк. 12. Летуценне. 13. Гадаванец. 15. Бядак. 16. Пакат. 20. Абавязак. 22. Найменне. 23. Пажытак. 24. Недавук. 26. Гумар. 27. Гонар.



Перакладзіце на беларускую мову

Па гарызанталі: 2. Валежник. 7. Борозда. 8. Горячая зола. 11. Ум, рассудок. 13. Лихорадка. 15. Основание. 17. Запах. 18. Кувшин. 19. Шаг. 20. Угол. 24. Жертва. 26. Художник. 27. Ворота. 28. Одеяло. 29. Лохмач. 31. Валенок.

Па вертыкалі: 1. Ужас. 3. Округ. 4. Гурт, отара. 5. Деревянная ограда. 6. Упрек. 9. Сенной сарай. 10. Кровельщик. 12. Кружево. 14. Ушат. 16. Усталость. 21. Обращение. 22. Скворец. 23. Опорок. 25. Бечевка. 26. Копуша. 30. Судьба.

ПАЭТЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ ТЫДНЁВІКА


Для ТМ становіцца ўжо традыцыяй (бо бракуе мясцовых аўтараў) перадрукоўваць вершы з «Нашай Нівы». Вось і сёння мы прапануем вам творы, узятыя з 1-га і 3-га нумароў адноўленае «НН» (1991 г.)

Алег МІНКІН

Трыпціх

1. А што калі?...

А што калі зусім сысьці ад іх,
лямпасых, галіфастых і тупых,
што уладаю нам намі ганарацца?
Пакінуць імі занядбаны сьвет
і адысьці на золку неўпрыкмет
туды, дзе нам захочацца застацца?
Атрэсьці іх, як пыл, з усім майном,
нажытым удыганьнем і маной,
і зь іхнім ад нарога і да дышла
спадлелым падам, дзе смурод гнільля
паўзе з крывавазорнага Крамля...



і адысьці, узяўшы толькі
прышласьць?

2. Эцюд

Ці на мейсцы стаю, ці брыду
наўздагад —
ты паўсюль гэткі самы, мой сьвеце
нягеглы.
Тут, куды ні павернеш, прыходзіш
назад
да дратоў, разапнутых на чырвані
цэглы.
Тут адзіна: ўцякаць ці стаяць
на пасту,
углядацца ў далёкасьць ці змружыць
павекі,
бо ўсё роўна ня зойдзеш, куды
ні прастуй,
у той край, дзе захочаш застацца
навекі.

3. Эцюд

Марна вакол ліхтароў зьзяюць
дрогкія німбы,
марна анёльскімі трубамі кляксаны
граюць,
кожны тут спуджана б'ецца, бы
ў нераце рыба,
і вастрыямі бакі да крыві разьдзірае...
Горадзе мой, ненавідны, каханы,
жахлівы,
мне ўжо ня мроіцца, што я адзін —
асаблівы —
вымкну з абдымкаў, дзе іншыя ўсе
паміраюць.

Адам ГЛЁБУС

Ты

Ты прыходзіш у цёмна-зялёныя дні,
ты прыходзіш у сьветла-зялёныя ночы.
Ты прыходзіш, і мы застаёмся адныя,
у халодным пакоі ратуемся моўчкі.
Асалода пунае ў люстэрку крывым.
Асалода, што зрушыла лёс
Левэркюна.
Пальцы ў цемры знаходзяць
напятыя струны.
Асалода пульсуе ў вагульнай
крыві.
Ты сыходзіш у цемру чырвоных
агнёў,
забіраеш адно безнадзейную стому,
пакідаеш падзеньне з чырвонае
стромы.
На паверхні пульсуе агульная кроў.

Сон

Засынаю, ізноў засынаю,
бо надзеі ніякай ня маю,
і ў жыцьці ўжо нішто не трымае...
Засынае душа, засынае,
перарэзаная трамваем,
а вар'яцтва душу абдымае,
закалыхвае і спавівае
чорна-мутарным дымам адчаю...
Сон ізноў не прыходзіць ноччу,
цемра выела мае вочы,
пэўна, злыдзень мяне ссурочыў.
Зазьвінеў палахлівы званочак...
Прыпыніўся драпежны трамвай,
невыносны навокал адчай.

Праз веды — да праўды і годнасці

Напрыканцы мінулага месяца ў Магілёве распачаў сваю працу «Народны Універсітэт». Ён арганізаваны грамадскім навукова-аналітычным цэнтрам «Беларуская перспектыва».

Праграма навучання ў НУ — гэта тры абавязковыя курсы: 1. Праблемы эканамічнага рэфармавання; 2. Паліталогія і геапалітыка; 3. Гісторыя Беларусі і беларускай культуры. Таксама ёсць 8 спецыяльных курсаў па выбару, сярод якіх: прафсаюзны рух, праблемы «трэцяга сэктару», і г.д. Выкладчыкамі ў НУ працуюць вядомыя навукоўцы ды грамадскія дзеячы, якія маюць неабходны досвед практычнай працы. Назаву толькі двух. Гэта сп. І.Нікітчанка — доктар сельска-гаспадарчых навук, прафесар Акадэміі навук Беларусі, сп. В.Чарнеў — загадчык секцыі паліталогіі Беларускага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэту.

У занятках Народнага Універсітэта возьмуць удзел сябры палітычных партыяў, грамадскіх і маладзёвых аб'яднанняў (прафсаюзных, навуковых, адукацыйных, культурніцкіх, рэлігійных і г.д.). Чакаецца, што НУ будзе актыўна супрацоўнічаць з кіраўнікамі прадпрыемстваў розных формаў уласнасці ды проста актыўнымі грамадзянамі, карацей кажучы — са ўсімі, хто пажадае атрымаць аб'ектыўную інфармацыю, сістэматызаваць свае веды ці атрымаць новыя.

Першую лекцыю ў НУ, прысвечаную праблемам жанчын у нашым грамадстве, прачытала сп. Л.Грознова, дэпутат Вярхоўнага Савету 12 склікання. Яна распавяла таксама аб рабоце заканнага заканадаўчага органа краіны, якім зьяўляецца Вярхоўны Савет. Пасля было яшчэ некалькі лекцыяў, а потым прысутныя бліжэй азнаёміліся з праграмай будучага навучання, выказалі свае пажаданні.

Уласная інф.

КУЛЬТУРНІЦКІЯ НАВІНЫ

Святло і цемра, надзея і вера

У выставачнай зале музэя этнаграфіі экспануюцца творы адной з самых цікавых магілёўскіх мастачак

У досыць стракатай палітры магілёўскіх мастакоў месца жывапісу Іны Полявай заўжды было і застаецца прыкметным. Для гэтага ёй спатрэбілася знайсці ўласную сюжэтную і каляровую форму, знайсці сваю творчую мову, выпрацаваць сваю мэтафарычную стылістыку.

Немагчыма пераказаць словамі Ініны карціны. Імі можна толькі пазначыць быццам простыя, а на самой справе складаныя, амаль філасофскія сюжэты. Вось, скажам, трыпціх «Ганак». Гэта позірк на сваё дзяцінства і са свайго дзяцінства. Гэта памяць аб дзяцінстве ў бабульчыным двары дзе-небудзь на Палянцы, дзе ўсё было пакрыта таямнічасцю і засталося такім жа ў дарослай памяці.

Адсюль, з «Ганку», «Занедбанага дома» і «Душы двара» прыходзяць да нас летуценні і вобразы ў цяперашнія сны. Там, у тых дварах, на тых ганках, на тых агульных кухнях, і гартаваліся нашы ўяўленні аб жыцці, праяўляліся першыя спробы, не заўсёды беспамылковая, адрозніваць святло ад цемры...



Мастачка Іна Полява зберагла і захавала ўспаміны аб нядаўнім, але ўжо мінулым часе, зрабіла яго зместам сваёй яскравай творчасці. Таму так шмат на яе палотнах матываў веры ў Бога і веры ў чалавека, які следуе Хрыстовым запаветам. На яе карцінах, якія зьяўляюцца жывапісным роздумам аб жыцці, Святло заўсёды адзеленае ад Цемры. З першага позірку разумееш, на чым баку мастачка. Яна на баку веры ў лепшае і надзеі на лепшае, да якіх і вядзе нас у жыцці адное толькі Святло. Яго і бачыш, стоячы перад карцінамі Іны Полявай... Не пашкадуйце на гэта крыху часу і вы.

Алена БАРЫСАВА.

Рэдактар Генадзь СУДНІК





Аналітычна-інфармацыйная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..



Кошт аднаго асобніка газэты ў гандлі праз сістэму Саюздруку — 3.000 рублёў. У свабодным продажы і ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў — па дамоўленасці.



АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 2. Тыраж 1100 асобнікаў.